ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
19 снежня 2019 г. № 84

# Аб зацвярджэнні праекта зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Музей-майстэрня мастака З.І.Азгура (будынак, агароджа, дворык)» па вул. З.Азгура, 8 у г. Мінску

На падставе пункта 3 артыкула 105 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры і абзаца пятага падпункта 5.27 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Музей-майстэрня мастака З.І.Азгура (будынак, агароджа, дворык)» па вул. З.Азгура, 8 у г. Мінску (дадаецца).

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**Міністр** **Ю.П.Бондар**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
19.12.2019 № 84

**Праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Музей-майстэрня мастака З.І.Азгура (будынак, агароджа, дворык)» па вул. З.Азгура, 8 у г. Мінску**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Музей-майстэрня мастака З.І.Азгура (будынак, агароджа, дворык)» па вул. З.Азгура, 8 у г. Мінску (далей – праект зон аховы) распрацаваны на падставе пункта 3 артыкула 105 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

2. Музей-майстэрня мастака З.І.Азгура (будынак, агароджа, дворык) па вул. З.Азгура, 8 з’яўляецца нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю (далей – гісторыка-культурная каштоўнасць) катэгорыі «3», унесенай у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пад шыфрам 713Д000005 у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г. № 578 «Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей».

3. Праект зон аховы распрацаваны праектным філіялам адкрытага акцыянернага таварыства «Белрэстаўрацыя» па заказе праектна-даследчага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскграда».

4. Праект зон аховы распрацаваны з мэтай забеспячэння захавання гісторыка-культурнай каштоўнасці і яе навакольнага асяроддзя, вызначае мяжу тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці, зоны аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці і іх межы, рэжымы ўтрымання і выкарыстання зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці.

5. Праект зон аховы распрацаваны на падставе архіўна-бібліяграфічных даследаванняў і аналізу горадабудаўнічай сітуацыі і ландшафту.

6. Праектам зон аховы ўстаноўлены межы тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці і наступныя зоны аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці: ахоўная зона, зона аховы ландшафту.

Схема зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Музей-майстэрня мастака З.І.Азгура (будынак, агароджа, дворык)» па вул. З.Азгура, 8 у г. Мінску дадаецца.

## ГЛАВА 2
## ТЭРЫТОРЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ

7. Тэрыторыя гісторыка-культурнай каштоўнасці вызначана ў мяжы агароджы дворыка і плошчы забудовы будынка музея-майстэрні З.І.Азгура.

Плошча тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці складае 0,12 га.

8. Мяжой тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці з’яўляюцца:

на паўночным усходзе – лінія, якая ідзе па паўночна-ўсходняй агароджы дворыка ад кропкі з каардынатамі 53°53'58.2559"N, 27°34'43.5600"E да кропкі з каардынатамі 53°53'58.1241"N, 27°34'44.0513"E; далей – лінія, якая ідзе да кропкі з каардынатамі 53°53'57.7335"N, 27°34'44.5390"E;

на паўднёвым усходзе – лінія, якая ідзе па паўднёва-ўсходняй агароджы дворыка ад кропкі з каардынатамі 53°53'57.7335"N, 27°34'44.5390"E да кропкі з каардынатамі 53°53'56.6755"N, 27°34'42.4972"E;

на паўднёвым захадзе – лінія, якая ідзе па паўднёва-заходняй агароджы дворыка ад кропкі з каардынатамі 53°53'56.6755"N, 27°34'42.4972"E, па паўднёва-заходнім фасадзе будынка музея-майстэрні З.І.Азгура;

на паўночным захадзе – лінія, якая ідзе па паўночна-заходнім фасадзе будынка музея-майстэрні З.І.Азгура, па паўночна-заходняй агароджы дворыка да кропкі з каардынатамі 53°53'58.2559"N, 27°34'43.5600"E.

9. Пры ажыццяўленні дзейнасці на тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці павінны выконвацца патрабаванні Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

## ГЛАВА 3
## АХОЎНАЯ ЗОНА

10. Ахоўная зона гісторыка-культурнай каштоўнасці ўстаноўлена зыходзячы з неабходнасці захавання гісторыка-культурнай каштоўнасці і стварэння спрыяльных умоў для яе ўспрымання.

11. Ахоўная зона гісторыка-культурнай каштоўнасці акружае будынак музея-майстэрні З.І.Азгура і агароджу з дворыкам з усіх бакоў.

Плошча ахоўнай зоны складае 1,3 га.

12. Мяжой ахоўнай зоны гісторыка-культурнай каштоўнасці з’яўляюцца:

на паўночным усходзе – лінія, якая ідзе ад кропкі з каардынатамі 53°53'58.6437"N, 27°34'43.9319"E да кропкі з каардынатамі 53°53'57.7895"N, 27°34'45.5342"E;

на паўднёвым усходзе – лінія, якая ідзе ад кропкі з каардынатамі 53°53'57.7895"N, 27°34'45.5342"E да кропкі з каардынатамі 53°53'56.4581"N, 27°34'42.9528"E;

на поўдні – лінія, якая ідзе ад кропкі з каардынатамі 53°53'56.4581"N, 27°34'42.9528"E да кропкі з каардынатамі 53°53'56.5427"N, 27°34'42.0527"E;

на паўднёвым захадзе – лінія, якая ідзе ад кропкі з каардынатамі 53°53'56.5427"N, 27°34'42.0527"E да кропкі з каардынатамі 53°53'57.9327"N, 27°34'40.3186"E;

на паўночным захадзе – лінія, якая ідзе ад кропкі з каардынатамі 53°53'57.9327"N, 27°34'40.3186"E да кропкі з каардынатамі 53°53'58.2644"N, 27°34'40.8634"E; далей – лінія, якая ідзе па бартавым камені праезнай часткі няцотнага боку вул. Азгура да кропкі з каардынатамі 53°53'58.6437"N, 27°34'43.9319"E.

13. На тэрыторыі ахоўнай зоны гісторыка-культурнай каштоўнасці забараняецца:

узвядзенне будынкаў і збудаванняў;

размяшчэнне буйнапамерных (больш за 2,0 x 2,0 м, вышэй за 3,0 м) рэкламных канструкцый.

## ГЛАВА 4
## ЗОНА АХОВЫ ЛАНДШАФТУ

14. Зона ахова ландшафту гісторыка-культурнай каштоўнасці ўстаноўлена з боку паўднёва-заходняга фасада будынка музея-майстэрні З.І.Азгура на тэрыторыі азелянёнага ўчастка, які прылягае да тэрыторыі водна-зялёнага дыяметра р. Свіслач.

Плошча зоны аховы ландшафту гісторыка-культурнай каштоўнасці складае 0,58 га.

15. Мяжой зоны аховы ландшафту гісторыка-культурнай каштоўнасці з’яўляюцца:

на паўночным усходзе – паўднёва-заходняя мяжа ахоўнай зоны гісторыка-культурнай каштоўнасці ад кропкі з каардынатамі 53°53'57.9327"N, 27°34'40.3186"E да кропкі з каардынатамі 53°53'56.5427"N, 27°34'42.0527"E;

на паўднёвым усходзе – лінія, якая ідзе па паўночна-заходняй агароджы тэрыторыі камунальнага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Мінскводаканал» і ў створы з ёй ад кропкі з каардынатамі 53°53'56.5427"N, 27°34'42.0527"E да кропкі з каардынатамі 53°53'53.9751"N, 27°34'37.5641"E;

на паўднёвым захадзе – лінія, якая ідзе па бартавым камені праезнай часткі няцотнага боку вул. Пуліхава ад кропкі з каардынатамі 53°53'53.9751"N, 27°34'37.5641"E да кропкі з каардынатамі 53°53'55.1566"N, 27°34'35.2458"E;

на паўночным захадзе – лінія, якая ідзе ў створы з паўднёва-ўсходнім фасадам будынка па вул. Пуліхава, 15, па гэтым фасадзе ад кропкі з каардынатамі 53°53'55.1566"N, 27°34'35.2458"E да кропкі з каардынатамі 53°53'57.9327"N, 27°34'40.3186"E.

16. На тэрыторыі зоны аховы ландшафту гісторыка-культурнай каштоўнасці забараняецца ўзвядзенне капітальных будынкаў і збудаванняў.

**Схема зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці ”Музей-майстэрня мастака З.І.Азгура (будынак, агароджа, дворык)“ па вул. З.Азгура, 8 у г. Мінску**

Дадатак
да праекта зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці "Музей-майстэрня мастака З.І.Азгура (будынак, агароджа, дворык)" па вул. З.Азгура, 8 у г. Мінску




| ЭКСПЛІКАЦЫЯ НЕРУХОМЫХ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ | | |
|---|---|---|
| № на плане | Назвы | Катэгорыя гісторыка-культурнай каштоўнасці |
| 1 | Музей-майстэрня мастака З.І.Азгура | 3 |
| 1.1 | будынак | б/к |
| 1.2 | агароджа | б/к |
| 1.3 | дворык | б/к |

| ЎМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ | | |
|---|---|---|
| № п/п | Абазначэнне | Назвы |
| 1 | | Нерухомая матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць. |
| 2 | | Ахоўная зона нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. |
| 3 | | Зона аховы ландшафту матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. |
| 4 | | р. Свіслач. |
| 5 | | Мяжа водна-зялёнага дыяметра. |

Сістэма каардынатаў - VGS-84 latitude/longitude